# ПРАБЛЕМА ІНТЭРПРЭТАЦЫІ ТЭРМІНА “УСТОЙЛІВАЕ РАЗВІЦЦЁ” У СУЧАСНЫМ БЕЛАРУСКІМ МЫСЛЕННІ

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Лось Г.А.*

*Ермаловіч Дз.В. – к.ф.н., дацэнт*

У сучасным беларускім мысленні ўслед за міжнароднай супольнасцю распаўсюджваюцца ідэі ўстойлівага развіцця. На дзяржаўным узроўні актыўна прапагандуецца нацыянальная стратэгія устойлівага развіцця, але само паняцце для шырокіх пластоў насельніцтва не раскрыта. Без разумення самага тэрміна ўстойлівага развіцця і зацвярджэння яго трактоўкі, зразумелай усім, казаць пра пошук шляхоў рашэння міжнародных глабальных крызісаў не прыходзіцца.

На дадзены момант паняцце ўстойлівага развіцця ў беларускім асяроддзі ў большай ступені ўспрымаецца з пункту гледжання тэрміна ўстойлівасці, а згодна тлумачальнаму слоўніку “ўстойлівы” – пастаянны, які не падаецца ваганням. Адпаведна гэтаму з фармуліроўкі тэрміна на рускай і беларускай мовах можна палічыць, што ўстойлівае развіццё – імкненне да пастаянства.

Існуе шэраг тэорый для разумення канцэпцыі і паняцця ўстойлівага развіцця.

Згодна Міжнароднай камісіі па навакольнаму асяроддзю і развіццю пад устойлівым развіццём разумееца такое развіццё, якое задавальняла бы патрэбы сучаснага перыяду часу, але не ставіла бы пад пагрозу здольнасць будучага часу задавальняць свае патрэбы [1, с.110].

Паняцце ўстойлівае развіццё пайшло ад англіскага “sustainable”, што можа перакладацца яшчэ і як “сбалансаванае”, “якое падтрымліваецца самастойна”. Такой інтэрпрытацыяй скарысталіся ў Польшчы і “sustainable” пераклалі як “zrównoważony”, пазіцыянучы ўстойлівае развіццё з пункту гледжання сбалансаванага развіцця.

Адзін з падыходаў да разумення ўстойлівага развіцця заснаваны на дыялектычным законе пераходу колькасных характарыстык у якасныя і наадварот і выкарыстоўваецца ў цыклах Кандрацьева, Глаз’ева; у дадзеным кантэксце цыклічнасць – форма прагрэсіўнага развіцця, не стаяння на месцы.

У яшчэ адной канцэпыі постіндустрыялізм і устойлівае развіццё разглядаюцца як крыніцы масавага спажывання. На першы план выходзяць манапольная, планавая, таварна-размеркавальныя эканомікі.

Член-карэспандэнт НАН Беларусі П. А. Вадап’янаў гаворыць пра тое, што ўстойлівае развіццё павінна прадугледжваць магчымасць кіраваць цяперашнім з будучыні, неабходна нораўнае кіраванне будучыняй, а тэрмін устойлівае развіццё разглядае з пазіцыяй “дастатковасці” і “сбалансаванасці”.

Доктар філасофскіх навук Э. М. Сарока сцвярджае, што ўстойлівае развіццё па азначэнню немагчыма, любое развіццё ёсць вагальны працэс, і адбываецца па экспаненце. У яго артыкулах сустракаецца тэрмін дынамічнае ўстойлівае развіццё.

Аналіз літаратурных крыніц паказвае, што праблема інтэрпрэтацыі ўстойлівага развіцця на сённяшні дзень знаходзіцца ў цэнтры ўвагі вучоных і дасюль з’яўляецца неадназначнай, недастаткова распрацаванай і актуальнай як на міжнароднай арэне, так і ў беларускім навуковым асяроддзі.

Ва ўмовах нарастаючай патрэбы разумення ўстойлівага развіцця беларусы маглі бы звярнуцца да магчымасцяў беларускай мовы і па аналогіі з палякамі выбраць больш адпаведны тэрмін – “ураўнаважае развіццё”, што будзе сінанімічна замежнаму слову “сбалансаваны”. Такім чынам, можна пазбавіцца праблемы неадназначнасці трактоўкі слова “ўстойлівы”.

Актуальным з’яўляецца і пытанне пераадолення крызісаў пры дапамозе ўстойлівага (ураўнаважанага) развіцця. Згодна В. С. Сцёпіну крызісы бываюць двух відаў: антрапалагічны і экалагічны, астатнія з’яўляюцца вытворнымі ад іх. Рэзкае абвастрэнне гэтых крызісаў ставіць пытанне ад пошуку новых стратэгій развіцця. Такія стратэгіі могуць прывесці да новага тыпу цывілазацыйнага развіцця [2, с.353]. А гэта ў сваю чаргу прадугледжвае фарміраванне новых каштоўнасцяў, якія адпавядаюць ідэалу захавання і сбалансаванага развіцця біясферы і чалавецтва.

У такім выпадку канцэпцыю ўраўнаважанага развіцця можна было бы трактаваць як дасягненне разумнай сбалансаванаці сацыяльна-эканамічнага развіцця чалавецтва і захавання навакольнага асяроддзя.

З гэтага пункту гледжання можна зрабіць выснову, што гэты напрамак сацыяльна-экалагічнай палітыкі павінен быць выкарыстаны для распрацоўкі мадэлі ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Коряков, А. Г. Методологические вопросы устойчивого развития предприятий / А. Г. Коряков //Вопросы экономики и права. – 2012. – №4. – С.110-114.

2. Стёпин, В. С. Кризис современной цивилизации и проблема объединяющих ценностей /В. С. Стёпин **// Национальная** философия в глобальном мире : тезисы Первого белорусского философского конгресса / Национальная академия наук Беларуси, Институт философии ; редкол.: В. Г. Гусаков (пред.) [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2017. – 765 с.